№№145–146
(2873–2874)

26 верасня 2008 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная воля».
Кошт — свабодны.

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...

Якуб КОЛАС

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто не зрабіў перадаплату і хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

Шаноўныя чытачы!
Па пытаннях распаўсюджвання газеты жыхары сталіцы могуць звяртацца па тэлефоне 328-63-93, усе астатнія— па тэлефоне 328-68-71.

БЛІЦ

Напярэдадні выбараў дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў кіраўнік Беларусі Аляксандр Лукашэнка заявіў літаральна наступнае: *"Мы зрабілі ўсё, каб выбарчы працэс праходзіў адкрыта, чэсна і дэмакратычна. Мы і так скачам пад дудку назіральнікаў, і мы зацікаўленыя ў тым, каб новы парламент быў прызнаны на міжнароднай арэне"*.

Некаторымі гэтыя словы Лукашэнкі былі расцэнены як ультыматум для назіральнікаў.

Таму сёння "Народная воля" пацікавілася ў сваіх рэспандэнтаў:

А што б назіральнікам сказалі Вы?

Уладзімір КОЛАС,
дырэктар зачыненага ўладамі Беларускага гуманітарнага ліцэя, балатаваўся кандыдатам у дэпутаты ў 2004 годзе:

— Шкада, што перад выбарамі ў некаторых людзей ёсць патрэба выдаць жаданае за сапраўднае. Я б заклікаў назіральнікаў быць сумленнымі, адэкватна ацэньваючы палітычную сітуацыю, якая склалася ў краіне. Толькі аналізуючы сітуацыю, назіральнікі могуць зрабіць высновы.

Андрэй ЮРКОЎ,
зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты па Горацкай выбарчай акрузе:

— Што ім сказаць? Насамрэч, сцэнар, па якім праходзяць выбары, не змяніўся ў параўнанні з мінулымі выбарчымі кампаніямі. Я б ім таксама сказаў, што на сённяшні дзень пытанне аб прызнанні ці непрызнанні выбараў "адарвана" ад самога выбарчага працэсу. Беларускіх чыноўнікаў хвалюе пытанне аб адмене эканамічных санкцый. У абмен улады спрабуюць зрабіць карцінку чэсных выбараў. Але, на маю думку, санкцыі здымаць трэба ў незалежнасці ад таго, ці будуць прызнаныя гэтыя выбары. А самі выбары ў Беларусі дэмакратычнымі прызнаны быць не могуць, бо такімі не з'яўляюцца апрыёры.

Сяргей ВАЗНЯК,
сябра Партыі камуністаў Беларускай, зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты па Сенненскай выбарчай акрузе:

— Я б паведаміў назіральнікам, што выбарчая кампанія ў Беларусі праходзіць з грубымі парушэннямі выбарчага заканадаўства. За прыкладамі далёка хадзіць не трэба. Мой сапернік — намеснік кіраўніка Адміністрацыі Аляксандра Лукашэнкі спадар Папкоў не сышоў у адпачынак 28 жніўня, як гэтага патрабуе выбарчае заканадаўства. Агітаваць за сябе ён пачаў, знаходзячыся на працы, а ў адпачынак пайшоў толькі 1 верасня. Далей. Пры сустрэчы з персаналам коханаўскай бальніцы за Папкова агітавалі мясцовыя чыноўнікі. Сустрэча праводзілася ў працоўны час, да таго ж з выкарыстаннем адміністрацыйнага рэсурсу. Гэта таксама парушэнне. І такіх прыкладаў можна прыводзіць мноства. Таму я б сказаў назіральнікам, што ў выпадку перамогі Папкова выбары па нашай акрузе прызнаваць не варта. Што да пасажаў Аляксандра Лукашэнкі наконт празрыстасці і адкрытасці выбарчага працэсу, то гэтыя словы — няпраўда. Я б з задавальненнем разам з Аляксандрам Рыгоравічам адправіўся на сваю выбарчую акругу, каб Лукашэнка асабіста запэўніўся, што кампанія праходзіць з парушэннямі.

Юрый БЫЧКОЎ, інжынер:

— У першую чаргу, я б нагадаў назіральнікам, якія будуць працаваць на выбарах, аб тым, што яны незалежныя і незацікаўленыя асобы. Таму каму як не ім дамагацца дазволу прысутнічаць пры падліку галасоў? Акрамя таго, я б папярэдзіў назіральнікаў, што яны павінны адэкватна рэагаваць на парушэнні, калі такія будуць, як з боку праўладных, так і з боку апазіцыйных кандыдатаў. І потым рабіць вывады.

Людміла ГРАЗНОВА,
сябра Аб'яднанай грамадзянскай партыі, кандыдат у дэпутаты па Партызанскай акрузе Мінска:

— Назіральнікі павінны ведаць, што кіраўнік нашай дзяржавы гаворыць пэўныя рэчы ў залежнасці ад сітуацыі, якая складваецца ў краіне. Пра адны і тыя ж рэчы ён можа гаварыць з рознымі акцэнтамі. Галоўнае, каб назіральнікі, асабліва міжнародныя, зразумелі, што не з'яўляюцца ворагамі тут, у Беларусі. Як бы там ні было, іх місія вельмі адказная, і ў тым ліку ад іх сумленнасці залежыць лёс Беларусі.

Зінаіда КРЫШТАЛЁВА, пенсіянерка:

— Я б сказала назіральнікам, што пытанне аб прызнанні ці непрызнанні вынікаў выбараў залежыць менавіта ад ступені ўсебаковасці той інфармацыі, якую яны здолелі сабраць падчас знаходжання ў Беларусі. Таму я выказваю спадзяванне, што назіральнікі здолеюць выканаць сваю місію праўдзіва і аб'ектыўна.

Апытанне праводзіў Віталь ГАРБУЗАЎ.

НУ И НУ!


Участковая комиссия участка для голосования № 8
Центр – РУПП «Брествтормет», ул. Бауманская, 40
1. Богдан Вадим Александрович – собранием работников структурного подразделения ОАО «Брестское пиво»
2. Бондарева Айя Валерьевна – собранием работников структурного подразделения ОАО «Брестское пиво»
3. Бричиков Александр Александрович – собранием работников структурного подразделения ОАО «Брестское пиво»
4. Горегляд Олег Михайлович – собранием работников структурного подразделения РУПП «Брествтормет»
5. Дубина Людмила Ивановна – собранием работников структурного подразделения ОАО «Брестское пиво»
6. Змачинский Геннадий Антонович – собранием работников структурного подразделения РУПП «Брествтормет»
7. Иванец Татьяна Ивановна – собранием работников структурного подразделения РУПП «Брествтормет»
8. Кисель Екатерина Олеговна – собранием работников структурного подразделения ОАО «Брестское пиво»
9. Корнейчук Роман Николаевич – собранием работников структурного подразделения ОАО «Брестское пиво»
10. Лахина Елена Петровна – решением администрации Ленинского района г. Бреста
11. Макасевич Ольга Петровна – собранием трудового коллектива яслей-сада № 60 г. Бреста
Участковая комиссия участка для голосования № 9
Центр - клуб ОАО «Брестхлебопродукт», ул. Поплавского, 54
1. Белецкий Сергей Степанович – собранием работников структурного подразделения ОАО «Брестхлебопродукт» решением администрации Ленинского

Выборы проходят по закону?

Александр Лукашенко на днях заявил, что выборы в Беларуси проходят в соответствии с белорусскими законами. Но так ли это?

Как известно, больше всего нареканий в ходе этой и предыдущих избирательных кампаний вызывало то, что в избирательные комиссии не включены представители оппозиционных партий и не подконтрольных власти общественных организаций. А как по белорусскому закону должны формироваться комиссии?

Статья 35 Избирательного кодекса гласит:

"Политические партии, другие общественные объединения, трудовые коллективы организаций или коллективы их структурных подразделений из числа своих членов, а также граждане путем подачи заявления могут выдвигать в соответствующую территориальную, окружную, участковую комиссию только по одному представителю".

Мы специально выделили фразу — **"ТОЛЬКО ПО ОДНОМУ ПРЕДСТАВИТЕЛЮ"**.

Как сформированы комиссии на самом деле, вы можете убедиться из документов, помещенных выше.

СІТУАЦЫЯ

Пластылінавыя выбары,

альбо Аб тым, як кобрынская вертыкаль вырашыла праводзіць галасаванне

Можна сказаць дакладна: не толькі ў Кобрыне, але і па ўсёй Беларусі напярэдадні выбараў праўладная вертыкаль правяла спецыяльныя нарады, з тым каб узгадніць сцэнарыі правядзення галасавання.

Кобрынскі сябра Партыі БНФ Аляксандр Мех, зарэгістраваны кандыдатам у дэпутаты, цудам патрапіў на такую нараду. Дзякуючы гэтаму "выбарчыя планы" кобрынскай вертыкалі сталі набыткам галоснасці.

"Нарада адбывалася ў актавай зале Кобрынскага райвыканкама, — дзеліцца ўражаннямі Аляксандр Мех. — *Мяне хоць і пазналі, але дазволілі застацца. На нарадзе прысутнічалі прадстаўнікі Кобрынскага райвыканкама — чыноўнікі розных узроўняў. Я так зразумеў, менавіта гэтыя людзі будуць адказнымі за правядзенне галасавання ў нашым горадзе"*.

І вось яно першае кобрынскае ноу-хау. Урны для галасавання ў гэтым горадзе на гэты раз будуць апячатаны... простым пластылінам, які можна набыць у любым магазіне. *"Менавіта такое рашэнне было прынята падчас нарады,* — гаворыць Аляксандр Мех. — *Цяжка сказаць, з чым канкрэтна звязана такое новаўвядзенне, але і дзіцяці зразумела, што пластылінавую "пломбу" пры патрэбе сарваць з урны куды лягчэй, чым пячатку з сургучу. Дарэчы, менавіта сургучовыя пячаткі выкарыстоўваліся ўвесь час для "аховы" змесціва выбарчых урн"*.

Далей — яшчэ цікавей. Падлік галасоў пасля галасавання на ўсіх участках будзе праводзіцца не ў адным, а ў некалькіх пакоях (на некаторых участках ажно ў шасці).

— З гэтым больш-менш усё зразумела, — разважае Мех. — Робіцца гэта для таго, каб тыя, хто падлічвае галасы, ведалі лічбы не па ўсім участку, а ў сваёй стопачцы, і не мелі ўяўлення аб рэальных выніках галасавання.

— Сяброў выбарчых камісій папрасілі быць з назіральнікамі "асцярожнымі", — расказвае Мех. — Як я разумею, гэта можа азначаць толькі адно: наблізіцца да стала пры падліку галасоў ім наўрад ці хто-небудзь дазволіць.

Цудоўна ведаючы карціну правядзення галасавання, Аляксандр Мех заўважае: "Для таго каб дапамагчы ўладзе пазбегнуць фальсіфікацый, трэба кантраляваць кожны яе крок. Я і сябры маёй каманды будзем спрабаваць узяць пад шчыльны кантроль літаральна ўсе выбарчыя ўчасткі. Што з гэтага атрымаецца — пакажа час. Чакаць засталося зусім нядоўга".

Віталь ГАРБУЗАЎ.

Няма ні веры балбатунам, ні жадання галасаваць

...На пляцоўцы ля універсама "Паўночны", што ў "Зялёным Лузе-6", мяне запыніў інтэлігентнага выгляду мужчына са жмутам, як можна было здагадацца, перадвыбарных лістовак.

— Вот, возьмите. Это — наш депутат! Да берите же, берите! — настойваў ён.

— Ужо і "дэпутат"? — здзівілася я. — Які ж тады сэнс ладзіць нейкія выбары, кідаць на вецер грошы?

— Ну, будущий депутат... — крыху сумеўшыся, "паправіўся" ён, па сутнасці паўтарыўшы тое ж самае і толькі пацвердзіўшы, што і ў першай ягонай рэпліцы не было выпадковай агаворкі.

— Такое ўражанне, быццам вы ведаеце пра "прызначэнне" вашага падапечнага дэпутатам яшчэ да галасавання, бо так упэўнена "перавялі" яго ў гэты ранг з кандыдатаў, — працягвала я.

— А вы не разводите тут политику! — забыўшыся на сваю інтэлігентнасць і на тое, што ўдзел у выбарах — самая што ні на ёсць палітыка, мой субяседнік абарваў дыялог і адышоў да купкі сваіх аднадумцаў...

Ехала дадому з лісткамі ў руках, так і не паспеўшы з-за нечаканай перапалкі разгарнуць, даведацца прозвішча кандыдата ў парламентарыі. А разгарнула — зноў здзівілася: зверху лістка красаваўся партрэт... так званага лідэра Ліберальна-дэмакратычнай партыі Сяргея Гайдукевіча. Што такое? Ён жа, помніцца, публічна заяўляў аб сваім няўдзеле ў выбарчай кампаніі ў Палату прадстаўнікоў...

Кідаю позірк ніжэй — пад партрэтам сумнавядомага Гайдукевіча і яго кіруючым выказваннем змешчаны другі партрэт — цяперашняга кандыдата па Усходняй выбарчай акрузе №107 Эдуарда Кузняцова — намесніка кіраўніка аддзялення ААТ "Белаграпрамбанк" і адначасова дарадцы намесніка старшыні Ліберальна-дэмакратычнай партыі. Цікава, што ж заяўлена ў яго праграме?

А вось што. "Замачыўшы" для пачатку ўсіх астатніх прэтэндэнтаў абвінавачаннем, што яны *"в очередной раз, пообещав избирателям прекрасное будущее"* ў сваіх праграмах, цана якім, маўляў, *"меньше стоимости бумаги, на которой они напечатаны"*, Эдуард Аляксандравіч выкладае сваю пазіцыю. *"Я не хочу вводить своих избирателей в заблуждение, обещая то, что нельзя реализовать"*. Што ж, разумна. Сапраўды, каму не надакучылі нерэальныя абяцанні ўсеагульнага (камуністычнага) шчасця без канкрэтных прапаноў канкрэтных змен у грамадстве? Напэўна, гэтыя канкрэтнасці я зараз і вычытаю ў праграмнай заяве кандыдата Кузняцова...

Вось, нарэшце, і яна, гэтая праграмная заява: "...в обществе необходимо обеспечить **порядок, стабильность и согласие на основе справедливости** (выдзелена ў праграме)". Нічога сабе "Праметэй" і "Гулівер" нашага часу, які бярэ на сябе ні многа ні мала — ажыццяўленне спрадвечнай, ды недасяжнай мары чалавецтва аб зямным раі. Толькі што, радком вышэй, абяцаў не абяцаць таго, чаго нельга рэалізаваць, — і сам абяцае! Што ж аўтар мае на ўвазе, гучна абвясціўшы прынцып *"справядлівасці"*? Ды тое ж самае, што і амаль усе іншыя, за выключэннем хіба прадстаўнікоў дэмсіл, прэтэндэнты на парламенцкае крэсла (дарэчы, як і на папярэдніх, 2004 года, выбарах). Хоць Эдуард Аляксандравіч і заявіў, што дыстанцыруецца ад пустапарожніх абяцанняў сваіх "таварищей" па жаданні рвануць у парламент, сам, на жаль, не здзейсніў абяцанага. І ў яго тое ж самае: прыгожыя агульныя словы наконт бясплатнай аховы здароўя, адукацыі, абароненай старасці, роўнасці грамадзян перад законам, годнай аплаты працы і гэтак далей...

Ну, хто ж супраць усяго гэтага? Цудоўна, дай Бог, як кажуць, нашаму цяляці ды ваўка з'есці. Але дзе ж хоць слоўца пра шляхі дасягнення грандыёзных мэтаў? Дарэмна шукаць гэта ў праграме прыхільніка партыі, якая падтрымлівае існуючы ў краіне "парадак". Незразумела, і пра які "парадак" цвердзіць элдэпээравец, хаця і робіць спробу даць расшыфроўку кшталту: "Порядок — это когда хозяин в стране народ, а не чиновник". Зноў, хто ж супраць? Але ж зноў — агульная прыгожая фраза, калі няма размовы аб рэфармаванні сённяшняй сістэмы кіравання. Хіба не бачна, што зараз разуменне справядлівасці ў тых, хто "наверсе" піраміды і хто ўнізе, грунтоўна розніцца? Ці не лепш было б ад глабальных узвышаных абяцанкаў перайсці да паўсядзённай зямной прозы? Паведаць выбаршчыкам, ці збіраецца "будучы дэпутат" дабівацца ўдасканальвання дзеючага заканадаўства? Каб, напрыклад, вышэйшы беларускі заканадаўчы орган набыў права кантраляваць выкананне законаў, дзейнасць выканаўчай улады? Ці каб разрэкламаваная "адрасная дапамога" гаротным людзям насамрэч трапляла па адрасе, і небаракаў, якім няма чым карміць дзяцей і плаціць за камуналку, не выкідвалі разам з немаўлятамі з кватэр на вуліцу? Або каб парламентарыі пачалі ўсталяванне справядлівасці з саміх сябе, крыху падрэзаўшы ўласныя немалыя льготы і вярнуўшы старым збяднелым людзям хаця б той мізэр, які *"змагары за народнае шчасце"* і адабралі? Ды дзе там: пра тое, што хвалюе людзей, — поўны маўчок.

Яшчэ многа пытанняў можна было б задаць Эдуарду Кузняцову, тым больш што ён сам запрашае звяртацца да яго з запытамі, просьбамі, заўвагамі. У другім, прыкладзеным да праграмы кандыдата лістку са зваротам *"Уважаемые избиратели! К вам обращается Либерально-демократическая партия Беларуси"* дадзены кантактныя тэлефоны штаба ЛДП па падрыхтоўцы і правядзенні выбараў у Палату прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь. Але чамусьці расхацелася аб нечым пытацца ў энергічнага піяршчыка блізкай Жырыноўскаму партыі: аказваецца, у афіцыйным спісе зарэгістраваных кандыдатаў (на сайце Цэнтрвыбаркама) ён падаецца... *беспартыйным*! Вось і вер пасля гэтага!

Няма ні веры такім абяцальшчыкам, ні проста жадання ісці галасаваць, бо гэта проста бессэнсоўна.

Яўгенія ЗАБЛОЦКАЯ,
жыхарка Мінска.

Беларусь — у ліку самых карумпіраваных краін

Міжнародная арганізацыя "Transparency International" (глабальная кааліцыя супраць карупцыі) адвяла Беларусі месца сярод найбольш карумпіраваных краін свету.

Краінамі з найбольшым узроўнем карупцыі сёлета сталі Самалі і Ірак. Беларусь апынулася на 151-м месцы, разам з Лаосам, Эквадорам, Папуа — Новай Гвінеяй, Таджыкістанам, Цэнтральнаафрыканскай Рэспублікай і Кот д'Івуарам. Аналізавалася сітуацыя ў 180 краінах.

SOS!

Помогите инвалиду!

О государстве судят по обеспеченности пенсионеров и по тому, как оно заботится об инвалидах.

Что в таком случае можно сказать о нашем государстве?

Я — инвалид третьей группы. Раньше, до отмены льгот, я мог рассчитывать на поддержку государства. А теперь — нет.

Заезжаю недавно на протезный завод. Вижу: таких, как я, одноногих, очень много! И всем один ответ: протезы можете заказывать за полную стоимость — два миллиона рублей. И все остальное также за свой счет. Да при этом еще требуют 80 процентов предоплаты. Не у всех инвалидов найдется сразу сумма в миллион 600 тысяч рублей.

Замечу, медицинские экспертные комиссии дают третью группу инвалидности, когда нет 2/3 голени. Говорят: хотите вторую группу — обращайтесь к президенту.

Вот я и обращаюсь к вам, Александр Григорьевич, с просьбой обратить внимание на таких инвалидов, как я. Сегодня я еще подрабатываю, а что придется делать, когда уйду на пенсию? Просить милостыню? Собирать бутылки? Протез, скажу, нужно менять через каждые два года. Да и обувь не вечная. А еще ж нужны деньги на оплату квартиры, на питание, лекарства...

Я понимаю, какое-то упорядочение с предоставлением льгот нужно было проводить, но не в ущерб таким инвалидам, как я. А потому государство должно пересмотреть свое отношение к горемычным людям.

Евгений Иванович МЕЛЬНИКОВ,
житель г.Минска.

Іх лёс хвалюе Беларусь!



Юрый Захаранка
знік 3355 дзён таму



Віктар Ганчар
знік 3226 дзён таму

Анатоль Красоўскі
знік 3226 дзён таму

Дзмітрый Завадскі
знік 2939 дзён таму

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 ВЕРАСНЯ 2008 г.

ПАРТРЭТНАЯ ГАЛЕРЭЯ

«Праблема ўлады — непразрыстыя выбары»

Такую выснову робіць кандыдат у дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі журналіст і галоўны рэдактар грамадска-палітычнага штотыднёвіка "Барысаўскія навіны" Анатоль Букас.

— Паважаны калега, вы балатуецеся ў так званы беларускі парламент, нягледзячы на тое, што шэраг дэмакратычных партый і грамадскіх арганізацый прынялі рашэнне аб няўдзеле сваіх членаў у гэтых выбарах. Чаму вы прынялі такое рашэнне? Быў жа ў вас горкі досвед удзелу ў выбарах у Вярхоўны Савет 13-га склікання ў 1996 годзе, у давыбарах у Палату прадстаўнікоў у 2001 годзе і выбарах у 2004 годзе. Першы раз несумленныя члены акруговых камісій фактычна скасавалі вашу перамогу, потым пад надуманымі прычынамі здымалі вас з выбарчай дыстанцыі. Няўжо гэта вас так нічому і не навучыла?

— Ведаеце, мне не заўсёды зразумелая пазіцыя прадстаўнікоў дэмакратычных партый у сваім стаўленні да існуючага інстытута прадстаўнічай улады нашай краіны. Памятаю, як восенню 2000 года, калі адбываліся першыя выбары ў "палатку", у нашых дэмакратаў не атрымалася ігнараваць незаконна ўсталяваную галавой дзяржавы на руінах Вярхоўнага Савета Палату прадстаўнікоў. Хаця па ўсёй Беларусі, у тым ліку і ў Барысаве, тады прайшлі масавыя маніфестацыі і мітынгі супраць падманных выбараў у нелегітымны орган прадстаўнічай улады, што ўзнік як наступства лістападаўскага канстытуцыйнага перавароту 1996 года. Частка апазіцыянераў усё ж парушыла ўнытрыпартыйную дысцыпліну і ўзяла ўдзел у выбарах. Некаторыя з іх нават атрымалі дэпутацкія мандаты. Так што, мяркую, зараз позна размахваць шашкай. Нагадаю, восенню 2000 года я таксама байкатаваў гэтыя выбары. Але ж калі ўбачыў, што туды прайшлі знаёмыя мне сацыял-дэмакраты і "аб'яднаныя грамадзяне", то зімой 2001 года вырашыў паспрабаваць свае сілы ў давыбарах дэпутата па Барысаўскай гарадской выбарчай акрузе №62. Але тады, як вы згадваеце, тутэйшы выбаркам пад надуманай прычынай зняў мяне з дыстанцыі. І, напэўна, таму, што я меў усе шанцы перамагчы наменклатурнага саперніка. Нагадаю, тады ў Барысаве, як згадвалі дэмакратычныя СМІ, упершыню абкатвалася мадэль бяспройгрышных для стаўленікаў улады рэспубліканскіх выбараў. Яе, як вядома, спарадзілі небезвядомы тэлежурналіст Аляксандр Зімоўскі і старшыня колішняга Барысаўскага гарсавета Васіль Бараннік... Што яна сабой зараз уяўляе, такая мадэль непразрыстых выбараў, мы ўсе ведаем...

— У такім разе, чаму вы зараз ізноў балатуецеся ў Палату прадстаўнікоў, хаця мне падаецца, што перамогу члены акруговага выбаркама ўсё роўна аддадуць вашым сапернікам. Адзін з іх нібыта дэмакрат, але час ад часу падхвальвае ўлады быццам бы за сумленна арганізаваны выбарчы працэс у Барысаве. Другі — прадстаўнік вайсковай наменклатуры — жадае засядаць у парламенце трэці тэрмін запар. Мабыць, нехта з іх туды абавязкова прарвецца...

— Спадзяюся, што здаровы сэнс усё ж такі пераможа. І выбаршчыкі разбяруцца, хто агучвае лозунгі, а хто год за годам дапамагае ім вырашаць набалелыя праблемы. Напрыклад, апошнім часам на старонках нашай газеты друкаваліся шматлікія артыкулы ў абарону сасонніка на вуліцы Ватуціна, які мясцовыя ўлады хацелі фактычна знішчыць ды пабудаваць тут пяціпавярховы жылы дом. Але дзякуючы салідарнасці жыхароў мікрараёна і галоснасці праз "Барысаўскія навіны" нам удалося захаваць у горадзе прыгожую зялёную зону.

Дарэчы, я ўваходжу ў агульнарэспубліканскі спіс, сфарміраваны па ініцыятыве Еўрапейскай кааліцыі ў Беларусі. І бачу будучыню нашай краіны ў Еўрапейскім Саюзе.

— Што, на ваш погляд, дасць краіне сяброўства ў ЕС?

— Па-першае, беларускія тавары будуць бесперашкодна рэалізоўвацца на самым вялікім і багатым рынку планеты. Наша эканоміка зможа атрымаць самыя перадавыя тэхналогіі ды інвестыцыі ў мільярдах еўра ад вядучых сусветных кампаній пад будаўніцтва дарог, мадэрнізацыю жыллёва-камунальнай гаспадаркі, аздараўленне энергетыкі. Такую фінансавую дапамогу атрымалі нашы балтыйскія і польскія суседзі, якія чатыры гады таму ўступілі ў Еўрасаюз і зараз маюць істотны рост дабрабыту грамадзян. У Польшчы і краінах Балтыі пасля ўваходу ў ЕС ажыло эканамічнае жыццё ў сярэдніх гарадах, падобных Барысаву, і людзі прыкметна становяцца больш заможнымі.

— Можна больш падрабязна пра магчымыя выгады для людзей...

— Адкрыецца магчымасць легальна працаваць у любой краіне Еўрасаюза з захаваннем сацыяльных гарантый. Адпадзе дыктатарскае спараджэнне, якое вельмі часта носіць не толькі эканамічны, але і палітычны характар, — кабальная кантрактная сістэма, якая апрыёры немагчымая ў краінах ЕС. У нашым горадзе, напрыклад, у мінулым годзе дырэкцыя завода "Фрэбар" разарвала кантракт з прафсаюзным актывістам Анатолем Аскеркам без прад'яўлення яму якіх-небудзь прэтэнзій прафесійнага або дысцыплінарнага характару. Хоць Анатоль на гэтым прадпрыемстве працаваў больш за дзесяць год запар і меў высокі прафесійны разрад. Наша газета асвятляла судовы працэс, у ходзе якога Аскерка спрабаваў аднавіцца на працы, але дарэмна.

Але вярнуся да выгады для нашай краіны ад членства ў Еўрасаюзе. Ёсць усе падставы меркаваць, што за кароткі час зарплата ў Беларусі вырасце ў некалькі разоў. Сёння, да слова, сярэдняя заработная плата ў той жа Польшчы складае 1500 долараў за месяц. І, між іншым, заробкі там працягваюць расці. Гэта адбываецца пры больш нізкіх, чым у нас, коштах на вопратку, бытавую тэхніку і некаторыя прадукты харчавання.

— А як уваходжанне Беларусі ў ЕС адаб'ецца на дабрабыце пенсіянераў? На жыцці моладзі?

— Натуральна, рост зарплаты падштурхне і рост пенсій. Пенсіянеры атрымаюць магчымасць нармальна жыць, а не існаваць. У краінах Балтыі і Польшчы зараз некаторыя фірмы спецыялізуюцца на турызме для пенсіянераў, напрыклад, тут папулярныя робяцца паездкі ў Іспанію. Барысаўскія дзядулі і бабулі пра такое могуць толькі марыць. Ім, каб выжыць, трэба альбо шукаць падпрацоўку, або ўкалваць да сёмага поту на дачных участках.

Моладзь наша будзе вучыцца не толькі ў Беларусі, але і ў іншых краінах, будзе мець высокаплатную працу. Між іншым, у ЕС дзейнічаюць ільготы на праезд для вучнёўскай моладзі, і ніхто не думае іх адмяняць.

— Якія ж у такім выпадку ў нас могуць скласціся ўзаемаадносіны з Расіяй?

— Мяркую, для Беларусі вельмі важна захаваць стратэгічнае партнёрства з Расіяй. Бо рана ці позна паўстане пытанне аб сяброўстве Расійскай Федэрацыі ў Еўрасаюзе. Праўда, пакуль Еўрапейская кааліцыя не ставіць пытанне наконт сяброўства нашай краіны ў НАТО, мы ўлічваем негатыўныя адносіны Расіі да гэтага моманту.

— Вы, спадар Анатоль, гаворыце пра відавочныя перавагі нашага ўваходжання ў ЕС. Але хто чакае там нашу краіну з адыёзным рэжымам?

— У саліднай кампаніі салідных краін ніхто нікога не чакае. І тым не менш мы павінны імкнуцца туды патрапіць. І нам тут не трэба занадта прыбядняцца. Беларусь — невялікая кампактная краіна з высокаадукаванымі, працалюбівымі ды законапаслухмянымі грамадзянамі. У нашай культуры — агульнаеўрапейскі хрысціянскі падмурак. Я сам бачу і ведаю, што еўрапейцы, якія наведвалі Беларусь, гатовы падтрымліваць наша сяброўства ў ЕС. Пра такую магчымасць гавораць кіраўнікі шматлікіх еўрапейскіх краін. Дарэчы, больш за 10 год таму Беларусі прапаноўвалі ўваходзіць у Еўрасаюз разам з краінамі Балтыі. Але кіраўніцтва краіны адмовілася ад гэтай прапановы і нават пра такую прапанову нічога беларусам не паведаміла.

— Чаму, на ваш погляд, цяперашняя ўлада не можа забяспечыць наша сяброўства ў Еўрапейскім Саюзе?

— Праблема ўлады — непразрыстыя выбары ў нашай краіне. Амаль трэцяя частка беларускіх выбаршчыкаў пад ціскам працадаўцаў галасуе датэрмінова. Пры гэтым скрыні з бюлетэнямі не кантралююцца назіральнікамі ўночы. У выніку аказваецца, што большасць галасоў атрымліваюць кандыдаты ад улады. Падуладныя члены выбарчых камісій бюлетэні падлічваюць практычна без удзелу назіральнікаў, паколькі трымаюць тых на адлегласці, каб не бачылі сам працэс падліку галасоў. Дарэчы, выбарчыя камісіі ў большасці выпадкаў фарміруюцца з прадстаўнікоў аднаго працоўнага калектыву на чале з начальнікам. Такога няма нідзе ў Еўропе і нават у Афрыцы. У ЕС кажуць: правядзіце сумленныя і празрыстыя выбары, і мы будзем вам дапамагаць. Аднак кіраўніцтву нашай краіны, мусіць, больш важна захаваць хлебныя, так бы мовіць, месцы, чым гарантаваць дабрабыт народу.

А яшчэ праводзяць адкрыты палітычны пераслед тых журналістаў. Самі ведаеце, што нашу газету, як і "Народную волю", выкінулі з падпісных каталогаў і кіёскаў "Белсаюздруку", супраць прадстаўнікоў рэдакцыі ўчыняюцца паводле надуманых прычын судовыя справы, а чыноўнікі ўтойваюць праўдзівую інфармацыю ад недзяржаўнай прэсы. Самае сумнае, што гэты ўціск працягваецца ужо 16 гадоў і яму не бачна канца. І пра гэта трэба весці гаворку з парламенцкай трыбуны. Паколькі журналісты незалежных СМІ — гэта свайго роду санітары нашага грамадства.

— Дзякуй, калега, за цікавую размову.

Іван КАНДРУШЭВІЧ.
Фота аўтара.

Радкі з біяграфіі

Нарадзіўся 22 красавіка 1956 года ў вёсцы Лаўніца Барысаўскага раёна ў мнагадзетнай сям'і. Скончыў Белдзяржуніверсітэт. Жанаты. Мае сына — студэнта юрыдычнага факультэта БДУ.

Працаваў карэспандэнтам у мясцовай афіцыйнай прэсе, потым на Барысаўскім ВА "Экран" рэгуліроўшчыкам, выпрабавальнікам электрамеханічных і радыётэхнічных прыбораў ды сістэм па шостым разрадзе.

Больш за дзесяць год служыў у арміі, у асноўным за мяжой.

З 1992 года — заснавальнік, а потым выдавец і галоўны рэдактар незалежнай газеты "Барысаўскія навіны". Сябра Беларускай асацыяцыі журналістаў, кіраўнік абласнога аргкамітэта БСДП.

У канцы 2007 года стварыў і ўзначаліў Прыватнае вытворчае унітарнае прадпрыемства "Букас медыя-цэнтр", дзе працуюць 22 чалавекі.

Вось дык паспрыялі...

У дзяржаўнай газеце Лоеўскага райвыканкама "Серп і Молат" за 20 верасня 2008 года надрукаваны зварот да выбаршчыкаў кандыдата ў дэпутаты, які балатуецца па Хойніцкай выбарчай акрузе №47.

Улады так "рупіліся" змясціць гэты зварот да народа як мага хутчэй, што забыліся надрукаваць прозвішча, імя і імя па бацьку кандыдата ў дэпутаты. Ці не скандальны выпадак? Тым больш што размова ідзе пра зварот Рыгора Дашкевіча, дарадцы старшыні аблвыканкама, які мае намер трапіць у парламент.

Выбаршчыкі не ідуць на сустрэчы з безальтэрнатыўным кандыдатам

Сустрэчы выбаршчыкаў з кандыдатам у дэпутаты па Барысаўскай сельскай выбарчай акрузе №63 Васілём Гур'янавым, генеральным дырэктарам Рэспубліканскага вытворчага унітарнага прадпрыемства "Барысаўхлебпрам" неаднаразова пераносіліся, а то і зусім адмяняліся.

Тыя, што ўсё ж адбыліся, цяжка назваць шматлюднымі.

У прыватнасці, на сустрэчу ў ваенным гарадку Печы ў гарнізонны Дом афіцэраў, зала якога мае больш за дзвесце месцаў, прыйшлі ўсяго дзесяць выбаршчыкаў. Прычым самога кандыдата суправаджалі яшчэ пяць чалавек, уключаючы генерала Бобрыкава — камандуючага 72-м Аб'яднаным навучальным цэнтрам.

Такая сітуацыя, без сумнення, абумоўленая тым, што выбары ў гэтай акрузе пасля адмовы ў рэгістрацыі кандыдатам у дэпутаты Сяргею Салашу, пройдуць на безальтэрнатыўнай аснове.

ПРАГНОЗ

Хто болей?

"Шанцы прайсці ў парламент у прадстаўнікоў АДС ёсць, хаця і невялікія", — такую думку ў інтэрв'ю БелаПАН выказаў лідэр Партыі камуністаў Беларускай Сяргей Калякін.

"Каб стаць дэпутатам, дэмакратычны кандыдат павінен чыста перамагчы і пры гэтым не быць уключаным у "чорны спіс" апазіцыянераў, якіх ні ў якім выпадку не прапусцяць у парламент", — зазначыў ён.

На яго думку, у Палату прадстаўнікоў могуць трапіць не больш як пяць кандыдатаў ад АДС.

АКТУАЛЬНО

Возможны ли манипуляции с бюллетенями?

Избирательные бюллетени... Сколько их отпечатано, кто контролировал процесс изготовления, и может ли произойти некая фальсификация?

Мы решили прояснить ситуацию.

— Центральная комиссия по выборам и проведению республиканских референдумов еще в апреле установила формы документов, в том числе бюллетеней, — сказал в интервью корреспонденту "Народной воли" секретарь ЦИК **Николай Лозовик**. — В свою очередь окружные комиссии утвердили их содержание и разместили в типографиях заказы на изготовление. На сегодняшний день число избирателей составляет порядка 7 миллионов 100 тысяч человек. Однако мы, как и прежде, рекомендовали окружкомам сделать заказ и на изготовление страхового запаса бюллетеней (не более 10 процентов) на случай пожара, наводнения и других непредвиденных обстоятельств. Эта работа комиссиями сделана.

После изготовления бюллетеней в типографии они по акту передаются в окружные комиссии, а затем — на участки. Все, что касается бюллетеней, можно назвать четко контролируемой бухгалтерией. Так, расхождение в подсчетах буквально на один бланк влечет за собой повторный пересчет. Кроме того, по предложению миссии наблюдателей от ОБСЕ мы предупредили окружные комиссии о предоставлении возможности всем наблюдателям присутствовать при изготовлении и передаче бюллетеней...

Информация из миссий

— Наши представители не присутствовали при этих процедурах, — так кратко ответили на вопрос корреспондента "Народной воли" в миссии наблюдателей от СНГ.

В миссии же от ОБСЕ заявили, что, мол, наблюдатели собирались присутствовать, однако где, кто и каковы имеются замечания, пока точно не известно — все сведения должны еще поступить...

Информация из типографии

Франц Кутько, начальник офсетного цеха издательства "Белорусский Дом печати":

— Мы напечатали заказанный тираж и передали его на склад...

Станислав Казак, заместитель директора по производству:

— Заказы выполнены в полном объеме. Бюллетени переданы в окружные избирательные комиссии по акту. Никто из наблюдателей при этом не присутствовал...

Мнение эксперта

Сергей Альфер, руководитель юридической комиссии политсовета Объединенной гражданской партии:

— Конечно, в заявке можно написать, что, мол, необходимо изготовить столько-то бюллетеней. Но сколько изготовлено на самом деле — вопрос, считаю, остается загадкой. Кроме того, бюллетени у нас печатаются на обычной бумаге, у них нет никакой степени защиты. А окружные и участковые комиссии, находящиеся в полной зависимости от местных органов власти, вполне могут получить дополнительно неучтенные бюллетени, а затем использовать их "по усмотрению".

Официально

Николай Лозовик:

— Участковые комиссии должны будут отчитаться за использованные бюллетени перед окружными, а последние — перед ЦИК. Кстати, мы всегда идем навстречу пожеланиям наблюдателей. К примеру, они предложили, чтобы в ходе досрочного голосования опечатывание урн проходило в присутствии не менее двух третей от общего числа членов участковых комиссий. И мы приняли такое постановление. Наблюдателями от ОБСЕ также было предложено, чтобы на ночь урна опечатывалась, а на бумаге возле печати имелись подписи членов комиссии. ЦИК с этим согласилась и внесла дополнения в наши методические рекомендации. Поэтому любые домыслы насчет фальсификации я отвергаю...

Мнение эксперта

Сергей Альфер:

— Трудно проследить за подсчетом голосов при досрочном голосовании, ибо здесь порядок таков, что можно спокойно заменить сто процентов бюллетеней. Однако 28 сентября наблюдателям следует проявить жесткость — при подсчете голосов находиться на таком расстоянии, чтобы видеть содержание бюллетеней и контролировать процесс...

***

Такие вот точки зрения, суждения. Как пойдет процесс, покажет время. Однако хотелось бы, чтобы все-таки восторжествовала истина!

Игорь ГРИШАН.

Агітацыя супраць

Па ініцыятыве прадстаўнікоў гомельскай кааліцыі Аб'яднаных дэмакратычных сіл прайшлі сустрэчы выбаршчыкаў з мэтай агітацыі супраць кандыдатаў ад улады.

Першая сустрэча, на якой прысутнічала прыкладна 60 чалавек, уключаючы супрацоўнікаў міліцыі, прадстаўнікоў адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля, назіральнікаў місіі АБСЕ і журналістаў, адбылася каля Дома культуры "Фестывальны".

Карыстаючыся сваім выбарчым правам агітаваць як за, так і супраць кандыдатаў, лідэр гомельскіх апазіцыянераў Уладзімір Кацора загадзя паведаміў акруговай камісіі аб правядзенні такога сходу з мэтай агітацыі супраць кандыдатаў ад улады, але адміністрацыя Савецкага раёна адмовілася прадаставіць грамадзянам памяшканне для такіх мэт. Чыноўнікі спаслаліся на тое, што кандыдаты ў дэпутаты не выступалі з ініцыятывай правядзення такой сустрэчы. У выніку сустрэчу праводзілі на пляцоўцы перад ДК "Фестывальны" — афіцыйным месцам для правядзення сходаў з мэтай агітацыі.

Таксама планавалася правесці сход з мэтай агітацыі супраць кандыдатаў ад улады ў Цэнтральным раёне Гомеля, ініцыятарам сустрэчы выступіў прадстаўнік АДС Пётр Кузняцоў, які меў намер балатавацца ў парламент, але яго ініцыятыўная група не была зарэгістравана. Аднак выбаршчыкаў і ініцыятараў сустрэчы не пусцілі ў памяшканне ЖЭУ-27 — месца для правядзення агітацыі. Старшыня акруговай камісіі Гомельскай Цэнтральнай акругі №33 Андрэй Гарбачоў, які прыбыў на месца сходу выбаршчыкаў, патлумачыў грамадзянам, што ў памяшканні будзе выбарчы ўчастак, таму там рыхтуюцца да доўгатэрміновага галасавання. У выніку сустрэча з жыхарамі акругі прайшла на пляцоўцы каля ЖЭУ-27.

У сустрэчах узяў удзел кіраўнік аргкамітэта па стварэнні руху "За свабоду" Аляксандр Мілінкевіч. У гутарцы з гамяльчанамі ён адзначыў, што ідэю байкоту выбараў не падтрымлівае. "Калі думаць аб людзях, то наш байкот для людзей — дрэнна. Людзі і так у апатыі, і так не вераць, што нешта можна змяніць, а яшчэ і нас няма — скажуць: усё прапала. Мы павінны ў людзях абуджаць ініцыятыву і веру ў тое, што можна нешта змяніць, без гэтага нельга", — зазначыў экс-кандыдат у прэзідэнты.

Алена ГЕРМАНОВІЧ.

І ТАК БЫВАЕ

Выбаршчык прымусіў кандыдата ў дэпутаты цягаць дошкі на сёмы паверх

Незвычайныя гісторыі часам здараюцца з кандыдатамі ў дэпутаты Палаты прадстаўнікоў і сябрамі іх каманд. У Бабруйску ўдзельнік каманды кандыдата Алеся Чыгіра, выходзячы з кватэры пасля сустрэчы, апрануў чужы абутак. Прычым адзін туфель быў 42-га памеру, а другі — 45-га...

А вось кандыдату ў дэпутаты Кавальчуку, які балатуецца ў Мінску, давялося цягаць дошкі аж на сёмы паверх.

Гэты выпадак здарыўся ў адным з дамоў па вуліцы Мірашнічэнкі. Кавальчук і сябры яго каманды раскідвалі агітацыйныя матэрыялы. Дзверы ў пад'езд аднаго з дамоў адчыніў пенсіянер, які пацікавіўся, хто яны такія. Кавальчук патлумачыў і даў яму пачытаць сваю праграму. Пра тое, што было далей, расказвае сам Віктар Кавальчук:

— Ён спытаў: "А што вы будзеце рабіць пасля выбараў?" Як што? Людзям дапамагаць, кажу. Ён гаворыць: "Ну вось, давай, дапамажы". У яго ў пад'ездзе ляжалі некалькі чатырохметровых шырокіх дошак. І мы з ім гэтыя дошкі на сёмы паверх цягалі дзесьці паўгадзіны".

Пасля гэтага мужчына падзякаваў Кавальчуку і паабяцаў, што абавязкова за яго прагаласуе.

Таццяна Севярынец знялася з выбараў

Кандыдатка ад Аб'яднаных дэмакратычных сіл, прадстаўніца аргкамітэта па стварэнні партыі "Беларуская хрысціянская дэмакратыя" Таццяна Севярынец 23 верасня, у першы ж дзень папярэдняга галасавання, знялася з выбараў.

З самага пачатку кампаніі Таццяна Севярынец казала людзям, якія ставілі за яе подпісы, што выбары праходзяць са значнымі парушэннямі, камісіі сфарміраваныя пад вылучэнцаў улады і шанцаў прадстаўнікі дэмакратычных сіл не маюць. Таму і не хавала, што ў гэткіх умовах будзе вымушанай зняць сваю кандыдатуру.

У сваёй заяве Таццяна Яўгенаўна адзначыла ціск на сяброў яе каманды, цэнзуру з боку кіраўніцтва друкарні, якая зацягнула выданне ейных ўлётак, нематываваную адмову ў арганізацыі сустрэч з выбаршчыкамі на прадпрыемствах ды ва ўстановах, забарону агітацыйных пікетаў і, галоўнае, тое, што *"склад участковых камісій фарміраваўся пры самым непасрэдным удзеле... адзінага саперніка па акрузе, старшыні віцебскага гарсавета Генадзя Грыцкевіча", і таму няма ніякай упэўненасці, "што "кішэнныя" камісіі аб'ектыўна правядуць датэрміновае галасаванне і сумленна падлічаць галасы".*

Але свой удзел у выбарчай кампаніі былая кандыдатка не лічыць дарэмным. Шмат каму атрымалася данесці свае думкі пра сітуацыю ў краіне, свае меркаванні пра тыя змены, якія патрэбныя грамадству. Галоўнае, падкрэслівае Таццяна Севярынец, *"кампанія была цікавая: напоўненая сустрэчамі з рознымі людзьмі".*

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 ВЕРАСНЯ 2008 г.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Где Юрий Захаренко?



17 сентября исполнилось ровно 9 лет, как прокуратура Минска расследует уголовное дело по факту исчезновения экс-министра внутренних дел Беларуси генерала Юрия Захаренко.

Больше девяти лет семья Юрия Захаренко не знает, что сделано следствием в поисках их близкого человека.

Правозащитник и доверенное лицо семьи Захаренко Олег Волчек рассказал "Народной воле", что сделала общественная комиссия по установлению обстоятельств похищения главы МВД.

— Олег, вам не кажется, что тема громких исчезновений в последнее время как-то потерялась в повестке дня чиновников Евросоюза, которые сейчас пытаются наладить диалог с Лукашенко. Может, после освобождения политзаключенных и "гладких" парламентских выборов Европа уже не будет вспоминать о Захаренко, Гончаре, Красовском и Завадском?

— Я тоже заметил, что высокопоставленные лица Евросоюза все меньше и меньше об этом вспоминают. Хотя одним из 12 условий, выдвинутых Евросоюзом в 2006 году, является как раз проведение объективного расследования по фактам похищения оппонентов Лукашенко. На мой взгляд, диалог с белорусской властью возможен только тогда, когда власть скажет правду о том, что случилось с этими людьми. И когда к уголовной ответственности будут привлечены лица, виновные в их смерти.

— Прокуратура уже девять лет ведет дело об исчезновении Захаренко. Надо полагать, следователи как-то информируют родственников о проделанной ими работе…

— Могу привести фразу, которую следователи прокуратуры представляют семье Захаренко каждые три месяца, когда продлевается уголовное дело: "Сообщаю, что срок предварительного расследования по уголовному делу №110352 по факту исчезновения Захаренко Ю.Н. заместителем Генерального прокурора Республики Беларусь продлен до 24 сентября 2008 года. О результатах расследования Вам будет сообщено дополнительно". И так все девять лет... Разве это не цинизм? А ведь человек пропал не на войне, не во время стихийного бедствия, а был похищен в центре Минске, при свидетелях. Кроме того, официальные власти каждый год представляют информацию о результатах расследования по данному делу в Рабочую группу по насильно или недобровольно исчезнувшим лицам при Верховном Комиссаре ООН. Через четыре месяца после исчезновения Юрия Захаренко официальные власти сообщили в Рабочую группу, что нет оснований возбуждать уголовное дело, так как нет доказательств, что Захаренко стал жертвой преступления... Хотя в рапорте начальника криминальной милиции МВД Беларуси Николая Лопатика на имя прокурора города Минска Николая Куприянова от 19.05.1999 года сообщается, что необходимо срочно возбуждать уголовное дело по ст.101 УК РБ (умышленное убийство), поскольку из обстоятельств розыскного дела по факту исчезновения Юрия Захаренко усматривается, что он стал жертвой преступления.

С таким же запросом на имя генерального прокурора Республики Беларусь Олега Божелко обращался заместитель министра МВД Беларуси Михаил Удовиков 14.05.1999 года, указав, что Захаренко стал жертвой преступления, и попросив прокурора возбудить уголовное дело по ст.101 УК РБ.

На пытанне "Чаму?" супрацоўнікі кнігарань разводзяць рукамі. Беларускія кнігарні зусім не супраць рэалізоўваць айчынныя кнігі. І попыт на беларускія кнігі ёсць. Часта просяць класіку: Быкава, Караткевіча, Шамякіна. А альбом "Спадчына Беларусі" ў "Ведах" прадалі 1000 раз. Але нават праваныя часам аўтары, папулярныя выданні выпускаюцца не больш аднаго разу ў год.

"Калі б не камерцыйныя выдавецтвы, то на нашых паліцах беларускай літаратуры было б яшчэ менш, — адзначыла Таццяна Клімовіч. — Таму што дзяржаўныя выдавецтвы не часта радуюць нас выпускам новых кніг або перавыданнем старых. Тэматычны план выдавецтва "Мастацкая літаратура", якое сёння займае першае месца па выпуску беларускай літаратуры, складае 50—60 кніг у год. Прычым трэць з іх у выніку не выходзіць, а адкладваецца на наступны год".

Праблема не толькі ў выдавецтвах, але і ў адсутнасці якаснай беларускамоўнай літаратуры.

"У нас жа ніхто не піша кніг аб Вялікай Айчыннай вайне, — расказала Клімовіч. — *Большасць кніг па гісторыі ў нашай краме — ад рускіх аўтараў. Я ўжо не гавару пра спецыяльную літаратуру. У нас проста не выпускаюцца падручнікі і даведнікі па юрыспрудэнцыі, банкаўскай справе, гандлі, экалагічным праве. Калі расійскія аўтары сотнямі выпускаюць дэтэктывы, раманы, то масавай літаратуры беларускага паходжання мы можам радаваца пару раз на год".*

Таму і палохае кнігарні зацверджаная ўрадам Праграма імпартазамяшчэння, якая рэкамендуе скарацiць прысутнасць замежных тавараў на прылаўках да 30%. Калі кнігарні будуць пастаўленыя ў абавязковыя ўмовы існавання з продажу ў асноўным беларускіх выданняў, то яны могуць знікнуць, як маманты.

"Мы проста не выжывем у такіх умовах, — паскардзілася Таццяна Клімовіч. — *І спажыўцы таксама пацерпяць. Па-першае, стане цяжка дастаць неабходную літаратуру. Большасці выданняў, якія выходзяць у Расіі і іншых краінах, у Беларусі проста няма аналагаў. Чым можна замяніць Оксфардаўскі слоўнік?.. Па-другое, кошты на расійскія кнігі ўзрастуць у паўтара раза.*

Аб якой арыентацыі на беларускія выданні можа ісці размова, калі мы гандлюем расійскімі паштоўкамі і календарамі? Няўжо так складана наладзіць выхад беларускіх паштовак? Чаму расійскія выдавецтвы ўжо ў жніўні выпусцілі шмат календароў на 2009 год, а беларускі каляндар у нас сёння толькі адзін у продажы?"

Вольга ПРУДНІКАВА.

ВІНШУЕМ!

«Крыштальная сава» аказалася металічнай

Беларускія знаўцы атрымалі самы каштоўны прыз у свеце інтэлектуальных гульняў — "Крыштальную саву". Пра гэта было абвешчана падчас закрыцця чэмпіянату свету па "Што? Дзе? Калі?", які цягам мінулага тыдня праходзіў у курортным мястэчку Светлагорск Калінінградскай вобласці Расіі.

"Крыштальная сава" дасталася не каму-небудзь з беларусаў канкрэтна, а грамадскай арганізацыі "Беларуская ліга інтэлектуальных камандаў". Ад імя БЛІК на сцэну за "Савой" узняўся гомельскі знаўца Леанід Клімовіч.

"Намінаваліся на "Лепшы клуб МАК" санкт-пецярбургскі "Аэрабрэйн", што праводзіць цэлае сузор'е буйных міжнародных турніраў, і рыжскі клуб, за якім цягнуцца ўсе знаўцы краін Балтыі. Галасаванне па намінацыях было таемнае, галасавалі члены Міжнароднай асацыяцыі клубаў. Большасць з іх сышліся на тым, што наш шлях і нашыя заслугі больш каштоўныя", — расказаў Леанід Клімовіч.

Па яго словах, "Крыштальная сава" — гэта толькі традыцыйная назва. Ужо пэўны час совы бліскучыя і металічныя, але атрымліваць іх не менш прыемна.

Народная Воля http://www.nv-online.info
26 ВЕРАСНЯ 2008 г.

СЛЫШАЛИ?

Борис Тарлецкий не в обиде

Бывший заместитель генерального прокурора Беларуси генерал-майор Борис Тарлецкий рассказал журналистам, что не сильно опечален своей отставкой.

"Обиды у меня ни на кого нет, так что не надо тут искать чего-то такого... — сказал Борис Казимирович. — Все естественно, мне ведь скоро шестьдесят лет. Если бы мне было всего сорок, я, конечно, был бы опечален. А так — отчего? Я генерал по одной службе, по другой. Ну, чего мне еще хотеть? Я считаю, что служил как мог и делал свое дело как мог. Мне кажется, не совсем и стыдно за свое дело. Поэтому, вот такие вот дела..."

Борис Тарлецкий говорит, что пока не подыскивал себе новую работу.

"Хочу пока немножко отдохнуть, осмотреться", — сказал генерал.

ИЗ ЛИЧНОГО ДЕЛА

Борис Казимирович Тарлецкий родился 17 января 1949 года в деревне Городище Логойского района Минской области. После окончания школы и ПТУ работал в строительно-монтажных управлениях Бреста и Минска. Отслужив в армии, пошел в милицию. От рядового милиционера дослужился до генерал-майора — начальника Главного управления внутренних дел Минского горисполкома. Закончил юридический факультет БГУ, Академию МВД СССР. Женат, двое детей.

Работал заместителем министра внутренних дел, заместителем генерального прокурора Беларуси. С последней должности уволен 15 августа 2008 года.

Сергей Михалок не хочет кормить дармоедов

Группа "Ляпис Трубецкой" выложила свой новый альбом "Манифест" для бесплатного скачивания в сети интернет. Это первый подобный случай среди топ-артистов постсоветского пространства.

"Корпорации, медиа-холдинги, рекорд-лейблы и другие монстры шоу-бизнеса — это губительный фильтр для любых свежих идей! — считает лидер "Ляписов" Сергей Михалок. — Продажа аудионосителей, отчисления с концертов, авторские поборы кормят целую кучу этих дармоедов, а музыкант при этом получает жалкие проценты. Есть единственная возможность бороться с околомузыкальной системой — надо всем выкладывать музыку в интернет! Тогда она попадет к слушателю быстро и бесплатно. Если публике закатит — она придет на концерт, ну а если нет — "начните игру с начала".

Альбом можно скачать на портале TUT.BY.

ПОСТФАКТУМ

Пачатак, які змаглі ацаніць не ўсе

Новы канцэртны сезон не прынята пачынаць з гучных і нязвыклых выступленняў. Людзі жадаюць бачыць тых, каго ўжо чулі, але ніколі б не адмовіліся паслухаць яшчэ раз. Выступ украінскага гурта "Флёр" у клубе "Рэактар" быў чаканым, не шакіруючым, цікавым і вельмі восеньскім.

Другі мінскі канцэрт адэскага гурта выклікаў шмат супярэчлівых водгукаў. Чаго чакалі ад выступу сталічныя музычныя гурманы -- невядома, але, відавочна, не таго, што прапанаваў гурт.

"Флёр" ніколі не здзіўляў сваіх прыхільнікаў. На канцэртах не было фаершоу і піратэхнікі. Адзіным "спецэфектам" за ўсю канцэртную гісторыю гурта стала дэманстрацыя новага кліпа.

Дзве вакалісткі Вольга і Алена -- амаль адзіныя нязменныя ўдзельніцы калектыву -- першую палову выступу спявалі свае знаёмыя да апошняга слова кампазіцыі. Прагучала толькі некалькі песень з новага альбома "Эйфория". Спявалі ў сваім звычайным стылі: мякка, інтэлігентна і ўтульна. Канцэрт цалкам у стылі "Флёр". Ды і было б пэўна дзіўна, калі б пад песні аб пяшчоце, каханні і адзіноце ўдзельнікі скакалі па сцэне і білі гітары аб узмацняльнікі.

Не здзівіў гурт, а здзівіла публіка, якая, ведаючы стылістыку выканаўцаў, усё ж такі чакала чагосьці такога, чаго "Флёр" нікому і ніколі не прапаноўваў.

І самым дзіўным было тое, што мінская публіка дачакалася новага гучання ад гурта. Пад канец музыканты адмовіліся ад сваёй жаноцкасці, і стары добры рок-н-рол зайграл "флёраўскія" хлопцы, якія складаюць гурт "Легендарные Пластилиновые Ноги".

Марыя МАЛЕВІЧ.

АНОНС

В руках французского дирижера

1 октября управлять Государственным академическим симфоническим оркестром Республики Беларусь будет известный французский дирижер Фабьен Теериксен.

Фабьен Теериксен — бывший преподаватель по композиции в университете г.Пуатье и в университете д'Орсэ. Был директором проекта "Артерии", цель которого — обучение музыкальной композиции в Африке. В настоящее время маэстро является директором франко-афганского проекта оказания помощи в восстановлении музыкального образования в Кабуле.

Концерт организован при поддержке Посольства Франции в Республике Беларусь и компании BelTechExport.

СЯМЕЙНЫ АЛЬБОМ

Сяргей ЗАКОННІКАЎ:

«У мяне было пяць жанчын: жыў, як калючы асот сярод руж»

Днямі знакаміты беларускі літаратар,лаўрэат дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы Сяргей Законнікаў адсвяткаваў дзень нараджэння. З гэтай нагоды "Народная воля" пагартала сямейны альбом пісьменніка.

— Вашу вёску і вёску жонкі раздзялялі семдзесят кіламетраў. Як вы пазнаёміліся?

— Мы маглі б сустрэцца хутчэй, таму што адначасова вучыліся ў Мінску. У той час студэнты розных ВНУ часта хадзілі адны да адных на вечары, канцэрты, танцы. Але ў Мінску Лілю ніколі не сустракаў. Пазнаёміліся мы толькі тады, калі нас пасля вучобы вярнулі працаваць у родны Ушацкі раён.

— Ці праўда, што сям'я ваша пачалася з хуліганства?

— Так. Першы раз я ўбачыў сваю будучую жонку ў кафэ, куды яна разам з іншымі маладымі настаўніцамі прыйшла абедаць. Я прыгледзеўся да гэтай прыгожай дзяўчыны, і мне захацелася пахуліганіць *(смяецца)*. Падышоў да іх стала і, паказваючы на Лілю, сказаў: "Вось гэтая дзяўчына будзе маёй жонкай!" Дзяўчаты закрычалі: "Што за нахабства!" Але менш чым праз год мы сапраўды ажаніліся...

— Як пісьменнік вы, напэўна, надавалі адмысловую ўвагу літаратурнай падрыхтоўцы дзяцей...

— Стараўся не толькі чытаць ім, але і спяваць, і нават прыдумляць казкі. Шкадую, што з-за працы — спачатку журналісцкай, потым у ЦК партыі — не мог удзяляць шмат часу дочкам. Але вельмі рады, што, нягледзячы ні на што, абедзве дзяўчыны выраслі такімі, як мне хацелася — натуральнымі беларускамі, якія ніколі не здрадзяць сваёй краіне.

— Затое для ўнукаў час зараз ніхто не адбірае...

— Так, з імі я праводжу шмат часу, ваджу з сабой, вучу жыццю. А з іншага боку, і яны мяне вучаць — разам з імі пераасэнсоўваю многія рэчы. Некаторыя кажуць, што стамляюцца з унукамі. Мабыць, фізічна я таксама часам стамляюся, але не душой.

— Зараз дзеці жывуць асобна ад вас. Ці згодны вы з тым, што сям'ю лепш будаваць не на адной жылплошчы з бацькамі?

— Так яно і трэба. У краінах Захаду гэта ўжо норма. Там маладыя людзі, нават не выходзячы замуж, не беручы шлюб, рана пачынаюць здымаць асобнае жыллё. Іншая справа — нашы беларускія рэаліі. У нас маладым не хапае грошай, каб зняць нават аднапакаёўку.

У нашай сям'і Света пасля вяселля пераехала да мужа, а Алёна з зяцем, а потым і з унукам, жылі з намі — толькі ў гэтым годзе яны перабраліся ў сваю кватэру. Калі жыць па-людску, то можна жыць і разам. Але маладая сям'я павінна мацавацца самастойна, каб быць не хісткай, а дружнай, трывалай.

— Гавораць, што дзеці будуюць сем'і па мадэлі ўзаемаадносін сваіх бацькоў. Якая мадэль была перад вашымі вачыма ў дзяцінстве?

— Не заўсёды гэтая мадэль праходзіць праз усю сямейную дынастыю. Я вырас у сям'і, дзе было пяцёра дзяцей, а мая жонка выхоўвалася адна. Наша з ёй сям'я атрымалася нейкім сімбіёзам. Таму мы вучыліся адзін у аднаго. Я, напрыклад, у адрозненне ад Лілі, ведаў, як купаць дзіця, бо на маіх руках былі меншыя брацікі і сястрычкі. Таму вучыў жонку, як трымаць галоўку, якой павінна быць вада.

— Да таго часу, як дочкі паз'язджалі, вы жылі з трымя жанчынамі. Кім адчувалі сябе на гэтай клумбе?

— У мяне было нават не тры, а пяць жанчын: жонка, дзве дачкі, цешча і сабака — таксама жаночага роду. Таму жыў, як калючы асот сярод руж *(смяецца)*. Зараз, дзякуй Богу, з'явіліся і акрамя мяне мужыкі ў сям'і: спачатку зяці, потым унук...

— Пасля таго, як вас звольнілі з пасады галоўнага рэдактара "Полымя", некалькі гадоў вы не маглі знайсці працу. Лаўрэат дзяржаўнай прэміі імя Янкі Купалы не змог уладкавацца ні выкладчыкам, ні нават вартаўніком. Як да гэтага ставілася ваша сям'я?

— Жонку маю таксама ў свой час звольнілі з працы і пяць гадоў да пенсіі яна нідзе не працавала. Яна сказала: "Ты мяне трымаў пяць гадоў, цяпер я цябе буду трымаць — будзем жыць на маю пенсію". Я са свайго боку стараўся недзе падпрацаваць: перакладамі, рэдагаваннем работ, дробнымі праектамі. На чорны хлеб з кількай хапала.

— Вас самога маральна гэта не душыла?

— Чатыры гады без нармальнай працы былі вельмі цяжкімі. Непрыемна, калі цябе выкідаюць пад плот, заносяць у чорныя спісы і наладжваюць нейкія правакацыі. Але, з другога боку, я адчуў моцную падтрымку звычайных людзей. Яны запрашалі мяне выступаць у сваіх калектывах, арганізоўвалі выданне маіх кніг. Таму я ніколі не апускаў рукі.

— Значыць, вы прытрымліваецеся меркавання, што сапраўдны мужчына павінен быць карміцелем, а жанчына — захавальніцай агменю?

— Я лічу, што жанчына павінна працаваць на сям'ю, а не на нейкае кіраўніцтва. Хатнія клопаты, выхаванне дзяцей — праца не меншая, а то і большая, чым на заводзе. На Захадзе так часцей за ўсё і бывае: мужчына зарабляе грошы, а жанчына займаецца домам. У нас, калі ў жанчыны няма працы, то лічыцца, што яна не адбылася. Другая наша праблема — не заўсёды зарплаты мужа хапае на тое, каб пракарміць сям'ю...

— Вы строгі муж і бацька? Магло здарыцца такое, што вы не дазволілі б дачцэ выйсці замуж за яе абранніка толькі таму, што ён вам не падабаецца?

— Такога ў нас быць не магло. Жыццё вучыць дэмакратыі. Калі адзін чалавек кахае другога, то бессэнсоўна штосьці казаць і штосьці рабіць, ён усё роўна цябе не пачуе. А перашкоды на іх шляху могуць скончыцца толькі трагедыяй. Я не выбіраў дочкам мужоў. Яны выбіралі самі, пасля прыводзілі і толькі паказвалі *(смяецца)*.

Вольга ПРУДНІКАВА.

Дзень, з якога пачалася наша сям'я. Жонка Ліля скончыла Мінскі інстытут замежных моў, працавала настаўніцай. Пасля пераезду ў Мінск усё жыццё была рэдактарам у выдавецтве "Мастацкая літаратура". Зараз, ужо на пенсіі, падпрацоўвае ў Пушкінскай бібліятэцы.

З жонкай і дочкамі. Старэйшая дачка Алёна скончыла Акадэмію мастацтваў і зараз выкладае там. Малодшая Святлана — Педагагічны універсітэт.



На ўручэнні ордэна "За заслугі" III ступені (на здымку злева), якім мяне ўзнагародзіў украінскі прэзідэнт Віктар Юшчанка. У мяне шмат розных узнагарод, прэмій, але самым дарагім для мяне прызнаннем стаў слоік варэння. Пасля надрукавання ў 1989 годзе паэмы "Чорная быль" мне прыйшла пасылка ад пенсіянеркі з Пружанскага раёна са слоікам клубнічнага варэння. Ніколі не забуду словы з пісьма, якое суправаджала яго: "Мілы сынок, я сама расціла гэтыя клубніцы, палола іх, палівала, збірала, варыла варэнне. І зараз высылаю яго табе. Не хварэй, пішы такія паэмы, як ты напісаў".

З жонкай у Швейцарыі (на здымку справа). Мы часта бываем за мяжой. Не спецыяльна я жаніўся на дзяўчыне, якая ведае нямецкую мову, і не спецыяльна яна выйшла за хлопца, які часта ездзіць па нямецкамоўных краінах. Але выдатным веданнем нямецкай мовы сваёй жонкі я карыстаюся — заўсёды бяру Лілю з сабой і эканомлю на перакладчыках.





З унучкай Марынай. Любіў у свой час пасядзець у дзеда на шыі і ўнук Франак. І мне прыемна — хочацца маленькіх дзетак пакалыхаць. Але, акрамя ўнукаў, нікому не дазваляю садзіцца сабе на шыю.

Беларускія футбалісты выйгралі ў зборнай Англіі

Праўда, не ў адборачным матчы да чэмпіянату свету, а на чэмпіянаце планеты сярод артыстаў...

"Народная воля" паведамляла, што на другі чэмпіянат свету сярод артыстаў адправілася і беларуская зборная. Адразу па вяртанні з Новарасійска, дзе і праходзілі спаборніцтвы, капітан нашай каманды спявак і кампазітар Альберт Скараход падзяліўся ўражаннямі ад паездкі:

"У адрозненне ад першага чэмпіянату, які ў мінулым годзе праходзіў у Сочы, сёлетняе першынство выклікала яшчэ большы інтарэс у гледачоў, — гаворыць Скараход. — Нагадаю, што дэвізам спаборніцтваў быў слоган: "Дапаможам дзецям пачуць музыку". Усе атрыманыя ад рэалізацыі білетаў грошы накіраваны на набыццё імплантатаў для слабачуючых дзетак. У мінулым годзе было сабрана 230 тысяч долараў. Сёлета, па прыкідках арганізатараў, гэтая сума будзе на парадак вышэйшай".

Што да самога футбола, то беларусы, якія ў рэшце рэшт занялі 6-е месца з 12, сталі аўтарамі самай галоўнай сенсацыі першынства. "Мы нечакана нават для сябе выйгралі ў зборнай Англіі — 2:1, — працягвае Скараход. — Застаецца пажадаць, каб футбалісты нацыянальнай зборнай, якія будуць прымаць англічан у кастрычніку ў Мінску, выступілі не горш за нас".

Не абышлося на першынстве свету сярод артыстаў і без скандалаў, праўда, без удзелу беларусаў. "У гульні каманд Расіі, якая ў рэшце рэшт і стала чэмпіёнам, і румын было ажно чатыры выдаленні, — расказвае Альберт Мікалаевіч. — І ўсе ў румын. Румынскія госці, палічыўшы, што іх "засуджваюць", проста пакінулі поле падчас гульні, за што і былі дыскваліфікаваны".

Дарэчы, у канцэрце, які дала ў межах першынства і беларуская каманда, выступаў і прафесійны галкіпер — Андрэй Канапелька. "Высветлілася, што ў яго выдатны голас, — прызнаецца Скараход. — Ён выканаў некалькі народных песень, і мала хто здагадаўся, што ён не прафесіянальны спявак..."

Віталь ГАРБУЗАЎ.

РЕЗОНАНС

...И сайт Министерства культуры могли бы подтянуть до достойного развитой республики уровня

Материал "Театр по интернету" (№№133—134), посвященный виртуальным страничкам белорусских театров, вызвал немало откликов у посетителей сайта "Народной воли" nv-online.info. Мы решили опубликовать самые интересные комментарии.

Автор — offСАЙТ:

— Театр работает для зрителя. С каждым разом все больше зрителей приходит в театр, предварительно знакомясь с информацией о театре, размещенной в интернете. Нет информации — нет и соответствующей части зрителей.

Нашел форум этого Театра белорусской армии на форумах Министерства обороны и внимательно просмотрел содержание. Каково же было мое удивление, что на форуме ни единого разу за эти годы не было никого от самого театра! И ни одного официального комментария или сообщения. Более того, кто-то из администраторов сайта там выражал полную готовность сделать отличный боевой театральный сайт по представлении театром исходных материалов, которые, судя по всему, у театра накоплены.

А раз так, то, видно, дело и не очень-то в том, что пока нет собственного здания, а в привычке... Ведь когда появится собственное помещение, то прибавится и других забот. Возможно, что внутренняя экономика учреждений просто не принуждает к необходимости создания сайтов. Но разве эта же экономика обязывает учреждения красить стены?

Насчет многих сотен и тысяч долларов за создание и поддержание сайтов: красиво жить, конечно, не запретишь, но не думаю, что в простейших случаях попахивало бы такими затратами. Основные функции — оперативные информационные — блоги и на бесплатных площадках выполняют на все 300%...

Автор — Железный дровосек:

— Афиша Театра-студии киноактера размещается на сайте ОО "Белорусская гильдия актеров кино". И рассказывает о спектаклях за декабрь 2007 года...

Автор — Рас-гильдяй:

— ...А вот такой вопросик: почему на изготовленном и действующем сайте Академии искусств, некоторые странички банально не заполнены даже текстом? Ведь в Академии, кажется, даже преподают веб-дизайн. Могли б зачесть за дипломную или курсовую и академический сайт и, чего уж по маленькой, и сайт Министерства культуры могли бы подтянуть до достойного развитой республики уровня...

ИЗ ПЕРВЫХ УСТ

Иван ГОРДЕЕНКО:

«Завоевать медаль помог знахарь...»

На Играх в Пекине десятиборец Андрей КРАВЧЕНКО, завоевавший для Беларуси "серебро", удивил многих, но только не своего тренера Ивана ГОРДЕЕНКО. Даже тот факт, что Андрей претендует сейчас на звание лучшего легкоатлета Европы уходящего года, для Ивана Петровича просто "рядовое явление".

— Только что вернулись с Андреем из Франции, где проходил финал Гран-при, — рассказывает мой собеседник. — Андрей уверенно победил. А что касается его успеха на Олимпиаде... Последние два года для меня это не было неожиданностью. Хотя до этого, безусловно, всерьез его никто не воспринимал. Хотя Андрей Кравченко — чемпион мира среди юниоров, чемпион Европы, в прошлом году — лучший результат сезона...

— Говорили, что накануне Игр у Андрея были проблемы со здоровьем?

— Да, два месяца в себя не мог прийти. Поймали какую-то бациллу. Самое интересное, что даже не знали, что это такое. Легкие вроде чистые были, но кашель "лупил" такой, что не приведи Господь. Наверное, что-то вирусное. Кстати, до сих пор еще не прошло.

— Получается, что спортсмен выступал на Олимпиаде больным?

— Скажем так, не совсем здоровым. Причем и врачи особо не могли помочь, все же боялись, чтобы затем из-за принятых лекарств не обвинили в применении допинга. Перед Играми ездили в диспансер спортивной медицины, но, чтобы не наглотаться еще какой-нибудь заразы, пришлось даже к знахарю обратиться.

— ??!

— Я не шучю! Нашли какого-то народного целителя, тот прописал Андрею травки да прополис жевать. Вот так и готовились к стартам.

— В жизни ваш подопечный хлопот тренеру не доставляет?

— Нет, в этом плане все нормально. Рассудительный, практичный, знает, чего хочет от этой жизни. Знает, что нельзя пить, курить, гулять... Ну, вы меня понимаете?

— Понимаю. А жена у него есть?

— Господи, ему же всего 22 года, куда жениться-то?! Я бы хотел, чтобы он "окольцевался" как минимум после следующей Олимпиады. Сейчас же женитьба, с одной стороны, не вопрос, а с другой — огромная проблема.

— Для вас как тренера?

— Не только для меня, и для него тоже. Ведь может быть так, что сегодня у тебя с женой все хорошо, а завтра вы уже "на ножах". Слышал вот недавно, что российский прыгун с шестом расстался с девушкой, напился после этого и пошел пьяным прыгать на соревнованиях. Стресс у парня! Кстати, насчет спиртного... Андрей его не только не употребляет, но даже и запах не переносит. Даже я себе раньше мог позволить 100 граммов в компании, но последние два года вообще не притрагиваюсь к алкоголю. Потому что тренирую парней, которые, повторюсь, даже этого запаха переносить не могут. Приходится считаться.

— Что слышно у спортсмена с квартирным вопросом?

— Он не так давно построил квартиру в Гомеле за собственные деньги, маму в нее перевез. А до этого жил в общежитии. Что касается премиальной квартиры, то я даже и не знаю, полагается ли она серебряному призеру. Хотя Андрею уже присвоили звание заслуженного мастера спорта, меня наградили медалью "За трудовые заслуги".

— У Андрея есть какие-то увлечения?

— Да вот собаку себе после Олимпиады купил, теперь все свободное время с ней и возится. Маленькая такая, английский бульдог, Баксом назвал. Андрей говорит, что хорошо стресс снимает. Такая собачка — лучше, чем любой доктор. Говорит, что давно мечтал.

— Иван Петрович, Андрей сейчас выдвинут на звание лучшего легкоатлета Европы. Есть у него шансы победить?

— Самые реальные. Он же в этом году не только на Олимпиаде "серебро" выиграл, но был вторым и на чемпионате мира. Стал чемпионом Европы, занял первое место на Гран-при. У него очень хорошие шансы. Потому что столько медалей набрать спортсмену за один сезон — очень непросто. Более того — редкость для десятиборцев! Но Андрюха, видимо, относится именно к этим людям.

Алесь СИВЫЙ.



КОРАТКА

Застаемся ў еўра-афрыканскай зоне

Беларускія тэнісісты ў матчы Кубка Дэвіса выйгралі ў каманды Грузіі з лікам 3:0. Гэта дазволіла нашым спартсменам захаваць месца для нашай краіны ў першай групе еўра-афрыканскай зоны.

Заўважым, што гэтая сустрэча стала для Уладзіміра Валчкова дэбютам на капітанскім мосціку нашай каманды. У матчы супраць грузін за беларусаў выступалі вопытны Максім Мірны, а таксама маладыя спартсмены Сяргей Бетаў, Андрэй Каратчэня і Уладзімір Ігнацік.

Пасля заканчэння гульні Максім Мірны адзначыў, што перамога над грузінамі дазваляе гаварыць аб тым, што ў тэніснай зборнай пераемнасць пакаленняў ажыццяўляецца правільна.

Выграблі бронзу...

У грэчаскім горадзе Марафон адбыўся чэмпіянат Еўропы па веславанні. Беларусы вярнуліся адтуль з трымя ўзнагародамі. Наша двойка без рулявой у складзе Вольгі Шчарбачэні і Таццяны Кухто фінішавала трэцяй. Акрамя таго, з бронзавымі медалямі з Грэцыі вярнулася беларуская жаночая васьмёрка з рулявой, а таксама мужчынская чацвёрка без рулявога.

Амерыканцы супраць Сочы

Дзесяць амерыканскіх кангрэсменаў ўнеслі ў Палату прадстаўнікоў кангрэса ЗША рэзалюцыю, у якой заклікаюць Міжнародны алімпійскі камітэт тэрмінова перагледзець сваё рашэнне аб правядзенні зімовых Алімпійскіх гульняў 2014 года ў Расіі. Прычына — вайсковы канфлікт паміж Расіяй і Грузіяй.

"Міжнародны алімпійскі камітэт не стаў бы выбіраць Сочы ў якасці сталіцы гульняў, калі б чакаў, што Расія здзейсніць напад на Грузію. Міжнародны алімпійскі камітэт павінен неадкладна зрабіць крокі для таго, каб прызначыць новы горад, які стане гаспадаром зімовых Алімпійскіх гульняў", — гаворыцца ў рэзалюцыі.

Антон ВІТАЛЬЕЎ.

ФУТБОЛ

Себя показать и мир посмотреть...

На минувшей неделе матчем с именитым мадридским "Реалом" борисовский футбольный клуб БАТЭ стартовал в групповом этапе Лиги чемпионов.

Как известно, борисовчане проиграли — 0:2. Но проиграли достойно, потому что "Реал" — это даже не "Андерлехт" или "Левски". И уж тем более — не минское "Динамо". Испанский клуб преподал нашим футболистам хороший урок, но, скажем честно, на победу или даже ничью мало кто и рассчитывал. Хотя тренер испанцев Бернд Шустер был не очень доволен игрой своей команды.

"Учитывая, как мы начали встречу, я ожидал, что мы забьем больше голов, поэтому я разочарован, — признался после игры тренер. — Впрочем, радует, что мы взяли три очка. После первого гола было видно, что БАТЭ не сможет ответить, и нам надо было забивать в этот момент второй и третий мячи. В итоге же нам все пришлось начинать сначала. Мне не понравилось то, что мы расслабились. Почему это случилось? Спрашивать надо у игроков, не у меня. Я их об этом не просил. Мы упустили отличный шанс записать на свой счет крупную победу и порадовать болельщиков еще больше".

А вот наставник борисовчан Виктор Гончаренко не был так удручен поражением. "Итоговый результат не так плох, — заявил он. — Естественно, мы играли хуже, потому что остались вдесятером. Не могу сказать ничего плохого про "Реал". У нас молодая команда, и мы надеемся постепенно прогрессировать. Клуб впервые участвует в таком турнире, как Лига чемпионов, поэтому дебют вышел относительно неплохим.

— Насколько сложно в таком юном по тренерским понятиям возрасте руководить командой, которая вышла в Лигу чемпионов? — поинтересовались мы у Виктора Гончаренко.

— Абсолютно несложно, потому что я досконально изучил ребят, а со многими еще и играл. Я уже не первый раз говорю, что команда управляема и лично для меня в работе никаких проблем нет. Одно удовольствие.

— Когда было сложнее: теперь или в то время, когда вам пришлось возглавить БАТЭ после скандального ухода из команды в минское "Динамо" Игоря Криушенко?

— Ответственность должна быть всегда. Единственное, что теперь стало совсем другое внешнее давление. И на меня, и на команду. Когда давят на результат — это уже сложнее. Ведь чем больше ты достигаешь, тем больше от тебя требуют.

— А назначение год назад главным тренером команды стало для вас неожиданностью?

— Сейчас все это, конечно, надо переосмыслить, но я ни о чем не жалею. Я люблю эту команду и готов был бы прожить с БАТЭ прошлый год еще раз.

— После Криушенко вы меняли стиль команды?

— Естественно. У каждого ведь свой стиль. Если Игорь Николаевич считался больше демократом, то я выступил за установление диктатуры. То есть меня можно назвать демократом с вкраплением диктатуры.

— Таким в свое время слыл и известный тренер киевского "Динамо" Валерий Васильевич Лобановский...

— Ну, это слишком лестное для меня сравнение! Но я на самом деле всегда выступал за то, чтобы в команде в первую очередь была дисциплина. Это один из наиглавнейших залогов успеха.

— На ваш взгляд, выход БАТЭ в Лигу чемпионов — закономерность?

— Закономерно то, что на сегодняшний день мы сильнее бельгийского "Андерлехта" и болгарского "Левски". Хотя многие скептики не только не верили в нас раньше, но даже не верят и сейчас. Но я к этому отношусь спокойно.

— Что помогло БАТЭ так прогрессировать?

— Первое — это хорошая организация труда. И второе — такой же тренировочный процесс.

— Тогда, если вы не против, давайте "пройдемся" по соперникам БАТЭ в группе — мадридскому "Реалу", итальянскому "Ювентусу" и питерскому "Зениту"...

— Фантастические соперники! "Реал" — самый титулованный и богатый клуб мира. "Ювентус" — самый титулованный клуб Италии. "Зенит" — самый преуспевающий клуб России.

— Кто из трех соперников для БАТЭ более удобный?

— У всех такой класс, что они для нас и удобные, и неудобные одновременно.

— У клуба есть какие-то цели в Лиге чемпионов?

— Главное — это набраться опыта и ввязаться в бой. А там посмотрим. Хотя изначально не ставим цели набрать ноль целых, ноль десятых очков. Мы будем играть сами и смотреть, что нам будут позволять соперники. В любом случае, для всех футболистов это будет незабываемая школа.

Алесь СИВЫЙ.

P.S. *30 сентября на минском стадионе "Динамо" БАТЭ проведет очередной матч Лиги чемпионов с итальянским "Ювентусом".*

ГАЗЕТА — ЧЫТАЧЫ

Перадаплату за IV квартал зрабілі?

Усяго 4 дні засталіся да пачатку IV квартала. А многія не аформілі **перадаплату** за кастрычнік—снежань. Каб не застацца без "Народнай волі", зрабіце гэта, калі ласка, літаральна заўтра-паслязаўтраі. Пералічыць грошы, ведаеце, можна праз любы філіял "Беларусбанка" ці праз паштовае аддзяленне. Мінчане могуць апаратыўна зрабіць **перадаплату** таксама праз рэдакцыйны офіс (вул.Энгельса, 34а) альбо пазваніць па тэлефонах: 328-63-93 ці 328-68-71. Пасля званка да Вас прыйдуць нашы валанцёры са свежымі нумарамі газеты і дапамогуць аформіць **перадаплату** за любы тэрмін і па любым адрасе. Не маеце магчымасці аплаціць за ўсе нумары, якія выйдуць у кастрычніку — снежні — зрабіце гэта за месяц, два...

Нягледзячы на экстрэмальныя ўмовы выдання газеты, тарыфы па **перадаплаце** ранейшыя: на месяц — **9500** рублёў для індывідуальных чытачоў і **15.000** рублёў для арганізацый, прадпрыемстваў, устаноў, фірм. Заўважым: паколькі кошт газеты пры рэалізацыі ў розніцу з новага года павысіўся, то выгадна рабіць перадаплату, з тым каб газета дастаўлялася дахаты.

Банкаўскія рэквізіты "Народнай волі" такія:

УП "Народная воля": р/р 3012006535014, ААТ "Пріорбанк", ЦБП 113, код 749, УНН 100961759.

Вымушаны і на гэты раз звярнуць увагу на тое, што **перасылаць у рэдакцыю трэба не толькі копію плацежнага дакумента, але і запоўненую АБАНЕНЦКУЮ КАРТКУ**, узор якой друкуем і ў сённяшнім нумары.

Зноў жа: запаўняйце выразна, пажадана друкаванымі літарамі. Разумеем: для тых, хто рабіць гэта будзе ўпершыню, не вельмі прыемная рэч. Але што зробіш: каб своечасова атрымліваць газету, мы вымушаны звяртацца з такой просьбай.

З дапамогай "Народнай волі" разбудзім усіх абыякавых!

0402280179

ИЗВЕЩЕНИЕ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир

КВИТАНЦИЯ

ИЧУП «Народная воля»
получатель платежа
«Приорбанк» ОАО ЦБУ 113 г.Минск
наименование банка
Счет получателя 3012006535014 Лицевой счет код 749
УНН* 100961759
(фамилия, имя, отчество, адрес)

Вид платежа			Дата	Сумма
Предоплата за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г. (ненужное зачеркнуть)				
Плательщик			Пеня	
			Всего	

Кассир М.П.

* Заполняется только при осуществлении операции по уплате налогов.

Абонентская карточка

на номера газеты «Народная воля»
за июль, август, сентябрь, октябрь, ноябрь, декабрь 2008 г.
(ненужное зачеркнуть)

*Заполняется отчетливо **печатными буквами** и **обязательно** отправляется в редакцию с **копией платежного документа***

фамилия

имя **отч.**

индекс почтового отделения

область

район

название населенного пункта

город, городской поселок, поселок, деревня (нужное — подчеркнуть)

улица пр-т переулок *(нужное — подчеркнуть)*

дом *а,б,в,г* **корп.** **кв.**

(Примечание: если можете — укажите, пожалуйста, код подъезда или номер дом.телефона; в случае получения газеты через абонентский ящик обязательно укажите индекс и адрес почтового отделения)

СИТУАЦИЯ

Нет денег — нет игры

На минувшей неделе игроки футбольного клуба "Динамо" (Брест) объявили, что отказываются тренироваться и готовиться к матчам чемпионата Беларуси.

Таким образом спортсмены высказали свой протест в связи с 2-месячной задержкой зарплаты.

Сведения о том, что брестскую футбольную команду настиг серьезный финансовый кризис, появились после того, как в разгар нынешнего сезона сменился генеральный спонсор клуба — предприятие "Брестэнерго".

Теперь руководить футбольным хозяйством главной команды области без отрыва от основной работы поручено главе администрации Московского района города Бреста Александру Шишко, а вот место спонсора остается до сих пор вакантным. Из коридоров брестской власти приходит информация, что ведутся переговоры со многими серьезными компаниями (в том числе с российским капиталом), однако взять на себя расходы по содержанию команды они готовы только со следующего года.

О том, какова реакция руководства футбольного клуба на отказ игроков посещать тренировки накануне субботнего принципиального поединка с "Неманом" из Гродно, сообщил пресс-атташе "Динамо" (Брест) Эдуард Белемук: "На данный момент никакой реакции руководства не просматривается. Существует большая вероятность, что в пятницу будет все-таки получен кредит и с командой рассчитаются за июль, а возможно, даже и за август. А если выплат не будет и команда выйдет на игру, то играть будет понятно как".

По словам Эдуарда Белемука, тренерский штаб оказался на стороне футболистов: "Подписей тренеров там нет, но они солидарны с игроками, потому что находятся точно в такой же ситуации — им тоже не платят".

В субботу стало известно, что часть зарплаты футболистам все-таки выплатили.

Адрас рэдакцыі:
220030, Мінск, вул.Энгельса, 34а.
Прыёмная: тэл./факс (017) 3286871.
Тэл./факс рэкламнага аддзела: 3286904, 3286906
E-mail : nv@promedia.by
http://www.nv-online.info

Заснавальнік і галоўны рэдактар Іосіф СЯРЭДЗІЧ

У сувязі з адсутнасцю магчымасці рэдакцыя матэрыялы не рэцэнзуе і не вяртае, права ўступлення ў перапіску пакідае за сабой. За інфармацыю, размешчаную ў рэкламных аб'явах, рэдакцыя не адказвае. Могуць друкавацца матэрыялы, у якіх пазіцыя аўтараў не падзяляецца газетай. Пасведчанне аб рэгістрацыі перыядычнага выдання №246 ад 10 кастрычніка 1996 г. (пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі №224 ад 6 сакавіка 2000 г.). Надрукавана ў ТАА "Типография Михайлова - С", 214020, г.Смаленск, вул. Шаўчэнкі, 86. Па заказе ТАА "Типография Михайлова", 214000, г.Смаленск, вул. Кастрычніцкай рэвалюцыі, д.38, кв.54. Падпісаны ў друк 24.09.2008 у 17.00. Аб'ём 4 друк. аркушы. Тыраж: 10 026 экз. Заказ №